**С. Я. Новікаў**

# МАЛАВЯДОМЫЯ ФАКТЫ ВАЕННАГА ЛЕТА 1941 ГОДА Ў БЕЛАРУСІ

Зварот да малавядомых фактаў ваеннага лета ў Беларусі выклікаНы не толькі навуковымі абставінамі, колькі вострай патрэбай шырокай чытацкай аўдыторыі асэнсавана зразумець, чаму праз 80 гадоў пасля пачатку баявых дзеянняў германскага вермахта і Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі ў парадку дня беларускай ваеннай гістарыяграфіі стаіць пытанне аб ліквідацыі ўсё яшчэ існуючых «белых плямаў» у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны летам 1941 г. Ніхто з чытачоў нават не задумваецца, у якой ступені даследчыкі наблізіліся да вывучэння аб'ектыўнай рэчаіснасці трагічнага лета, калі ў пачатку таго ваеннага ліпеня ў нямецкім палоне апынулася больш паловы баявога складу і колькасці войскаў Заходняй асобнай ваеннай акругі, пра што ў савецкім наратыве вялося размова ў катэгорыі толькі «беззваротных страт». Напрыканцы лета іх доля пераўзыходзіла тры чвэрці, пры гэтым большасць з гэтай шматтысячнай лічбы складалі савецкія ваеннапалонныя, якія ў адпаведнасці з дырэктыўнымі савецкімі ўказаннямі ваеннага часу траплялі ў катэгорыя «здраднікаў». З такім кляймом многім з іх, каму давялося пасля пераможнага завяршэння вайны апынуцца ў савецкіх лагерах, не ўдалося развітацца на працягу ўсяго жыцця. Пра гэта сведчаць новыя дакументальныя і навукова-папулярныя выданні, якія апошнім часам сталі даступнымі для шырокай чытацкай аўдыторыі.

Разгледзім толькі адзін з малавядомых фактаў ваеннай гісторыі Беларусі, аснову якога на цяперашні час складаюць шматлікія архіўныя звесткі аб савецкім ваеннапалонных, якія апынуліся ў нямецкім палоне ў выніку баёў за Брэсцкую крэпасць да канца чэрвеня 1941 года. Ці ведаюць сённяшнія школьнікі і студэнты сапраўдную лічбу чырвонаармейцаў, якія патрапілі ў нямецкі палон у самым пачатку абарончых баёў на тэрыторыі крэпасці? Ці знойдзем мы адказ на гэта прынцыпова важнае пытанне ў дапаможніку «Вялікай Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)», падрыхтаванага для выкладання аднайменнага вучэбнага курса ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ў якасці базавай дысцыпліны? На вялікі жаль, апытанні студэнтаў першага курса нашага ўніверсітэта пераконваюць у тым, што пра такую лічбу часцей за ўсё не вядуцца размовы на ўроках па гісторыі Беларусі аб пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Даследаванне шырокага кола новых дакументальных крыніц, у тым ліку нямецкага паходжання, дазваляе нам пазнаёміцца з трагічнай старонкай геraічнай абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 года. Зварот да замежнай дакументальнай базы неабходны для таго, каб не паўтараць традыцыйныя даныя савецкага наратыву пра агульную колькасць абаронцаў крэпасці, лічба якіх на пачатак абарончых баёў складала 3500 савецкіх камандзіраў, камісараў і радавых. Паводле тагачаснай гістарычнай канцэпцыі ў ходзе ўпартых, цяжкіх і шматдзённых баёў за крэпасць, якія працягваліся да пачатку трэцяй дэкады ліпеня, кожны абаронца самаахвярна змагаўся з ворагам, часцей за ўсё да апошняй кроплі крыві. Заўважым, што такі наратыў пачаў складвацца ў другой палове 1950-х гадоў, калі на тэрыторыі крэпасці быў адкрыты першы музей-пакой аб геранчнай абароне. З адкрыццём велічнага Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» у пачатку 1970-х гадоў не змяніўся погляд на савецкіх ваеннапалонных, якіх практычна не згадвалі ў афіцыйнай музейнай экспазіцыі. І гэта нягледзячы на тое, што сярод дакументаў музея захоўвалася вядомая з лета 1942 г. справаздача камандзіра 45-й пяхотнай дывізіі вермахта аб узяцці крэпасці ў Брэст-Літоўску. Аднак упершыню поўны тэкст гэтага дакумента, без купюр, быў апублікаваны на старонках пятага нумара часопіса «Беларуская думка» толькі ў 2010 года. На той момант склалася парадаксальная сітуацыя, калі па тэме гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. найбольш грунтоўнымі і праведзенымі на сучасным узроўні даследаванні былі напісаны за межамі нашай краіны (Расія, 2008). Адной з прычын такой сітуацыі пры вывучэнні баявых дзеянняў у першыя дні Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі крэпасці можна назваць не толькі адсутнасць неабходных дакументальных крыніц, колькі спробу па захаванні традыцыйных падыходаў савецкага наратыву аб геаічнай абароне Брэсцкай крэпасці.

Навуковыя публікацыі, у тым ліку аўтара гэтых радкоў, а таксама расійскіх і нямецкіх даследчыкаў, у першую чаргу лейпцыгскага гісторыка К. Ганцара, сталі важным рубяжом для правядзення грунтоўных навуковых даследаванняў, базай для якіх з'яўляюцца малавядомыя нямецкія дакументы. Дзякуючы іх публікацыі ў апошнія гады створаны падставы для пошуку гістарычнай ісціны ў пытанні аб лёсе большасці абаронцаў крэпасці, якія апынуліся ў нямецкім палоне ў канцы чэрвеня 1941 года. У выніку ўсебаковага аналізу новых дакументальных крыніц, іх супастаўлення і крытычнай праверкі стала магчымым убачыць новыя аспекты трагічнай гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці. Галоўным крытэрыем для паказу маштабаў палону вызначаны параўнаўчы аналіз 40 нямецкіх дакументаў, галоўным вызначальным сярод якіх можна назваць справаздачу генерал-маёра Шліпера ад 8 ліпеня 1941 года, у якой упершыню згадваецца колькасць радавога і афіцэрскага складу з ліку абаронцаў, якія па розных прычынах патрапілі ў нямецкі палон. Як сцвярджаецца ў дакуменце, на момант захопу вермахтам Усходняга форта 29 чэрвеня 1941 года, у нямецкім палоне знаходзіліся 7223 чалавек, у тым ліку 101 афіцэр.

Цяперашні стан вывучэння праблемы дазваляе разглядаць тыя падзеі з двух бакоў, з аднаго боку – нямецкіх страт, панесеных у ходзе штурму крэпасці ў канцы чэрвеня 1941 г., і савецкіх страт, галоўным чынам – агульнай колькасці чырвонаармейцаў, хто апынуўся ў нямецкім палоне. Выкарыстоўваемыя ў цяперашні час дакументы 45-й пяхотнай дывізіі дазваляюць даследчыкам убачыць агульную і штотыднёвую колькасць чырвонаармейцаў, узятых на тэрыторыі крэпасці ў нямецкі палон на працягу часу ад 22 чэрвеня і да 1 ліпеня 1941 года. Так, у першы дзень, 22 чэрвеня 1941 года, гэта лічба складала 1100 чалавек, 23 – 1900, 24 – 1250, 25 – 857, 26 – 1150, 27 – 326, 28 – 170, 29 – 389, 30 – 38 чырвонаармейцаў. Гэтыя звесткі можна суаднесці з нямецкімі стратамі ў ходзе штурму крэпасці. Вынікае, што галоўная частка нямецкіх страт прыпадае на першыя тры дні баявых дзеянняў, калі быў забіты 371 ці 86,3 % ад усіх забітых (430) салдат вермахта. Савецкія страты характарызуюць дзве граніцы: ніжняя – колькасцю у 6713 чырвонаармейцаў і верхняя – агульнай колькасцю ў 7779 палонных. Зыходзячы з дакументаў нямецкіх страт можна аднавіць храналогію баёў за крэпасць, якія падзяляюцца на тры фазы: 1) першыя тры дні баёў з 22 па 24 чэрвеня: перыяд, калі на тэрыторыі крэпасці вяліся цяжкія баі; у гэты час нямецкі бок панёс самыя цяжкія страты – амаль 86,3 % забітых і да 70–80 % параненых нямецкіх салдат, а таксама захоп у нямецкі палон 56 % савецкіх салдат; 2) у час другой фазы (25–26 чэрвеня) былі ліквідаваны асобныя ачагі супраціўлення; на гэты час прыпадае амаль 7 % нямецкіх страт забітымі і каля 30 % савецкіх ваеннапалонных; 3) цягам трэццяй фазы – з 27 па 29 чэрвеня – быў ліквідаваны апошні аб'ект актыўнай абароны – Усходні форт на паўночным востраве. За гэты час вермахт не панёс істотных страт, тады як з савецкага боку колькасць палонных склала амаль 14 %.

Знаёмства з новымі дакументальнымі крыніцамі па тэме савецкага палону прыводзіць да шматлікіх высноў, у тым ліку метадалагічнага кшталту. Патрэбай часу для сучаснай беларускай гістарыяграфіі з'яўляецца: па-першае, на парадку дня ў календары даследчыкаў ваеннай гісторыі Беларусі павінна стаяць тэма аб трагічным лёсе савецкіх ваеннапалонных на тэрыторыі Беларусі, дзе загінуў кожны трэці ваеннапалонны з тых, хто ўдзельнічаў у баях на беларускай зямлі; па-другое, у студэнцкай і вучнёўскай аўдыторыі варта трымацца выключна выверaных і верыфікаваных фактаў і адстойваць навуковыя тэзісы, якія прайшлі праверку новымі дакументальнымі крыніцамі; па-трэцяе, перспектыву вызначае шырокае выкарыстанне новых крыніц і метадалагічных падыходаў, асабліва такога простага правіла, як абавязковы двухбаковы паказ баявых дзеянняў у ходзе баявых дзеянняў германскага вермахта і Чырвонай арміі на тэрыторыі крэпасці; па-чацвёртае, на цяперашні час не можа выклікаць сумневу неабходнасць «альтэрнатыўнага» падыходу пры правядзенні любога даследавання па ваеннай гісторыі Беларусі; па-пятае, толькі такія падыходы дазволяць наблізіцца да гістарычнай ісціны ў пытаннях аб'ектыўнага даследавання гісторыі нямецкага штурму і савецкай абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г., а таксама трагічнай старонкі гісторыі савецкіх ваеннапалонных, якая пачалася пісацца на беларускай зямлі з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны.